І В А Н   Ч Ы Г Р Ы Н А Ў

# БРАТ КАРАЛЯ

ДРАМАТЫЧНАЯ
АПОВЕСЦЬ
У ДЗВЮХ
ЧАСТКАХ



ІВАН ЧЫГРЫНАЎ

# БРАТ КАРАЛЯ

ДРАМАТЫЧНАЯ
АПОВЕСЦЬ
У ДЗВЮХ
ЧАСТКАХ

# ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ

- **Ягайла –** *кароль*
- **Свідрыгайла –** *брат караля*
- **Соф'я –** *каралева*
- **Вітаўт –** *вялікі князь Вялікага княства Літоўскага, Рускага Жамойцкага*
- **Іван Друцкі –** *князь, здаецца, стрыечны брат каралевы*
- **Жыгімонт –** *брат Вітаўта*
- **Юльян –** *стары рыцар з Вялікага княства. Маршалак сейма Вялікага княства*
- **Павятовы маршалак** *віцебскі*
- **Амсціслаўскі ваявода**
- **Праваслаўны біскуп**
- **Каталіцкі біскуп**
- **Кракаўскі біскуп**
- **Ротмістр**
- **Чалавек у квяцістым жупане**
- **Чалавек у чорным**
- **Садоўнік**
- **Вершні**
- **Ганец**
- **Ахоўнік**
- **Князі, баяры, паслы, рыцары, шляхта, спевакі і танцоры, слугі...**

# ЧАСТКА ПЕРШАЯ

## К А Р Ц І Н А І

*Ягайлаў каралеўскім садзе. Штосьці паказвае на дрэве садоўніку. Той схіляе да сябе галінку з яблыкамі, доўга ўзіраецца. Падыходзіць малодшы брат Ягайлаў – Свідрыгайла.*

**Ягайла.** Го, брат! А я вось заняты садоўнічым клопатам. Некалі сам уторкнуў у зямлю гэтае дрэва. Цяпер чамусьці хварэе. І яблыкі дае, і хварэе ўжо каторы год. Відаць, гледзячы на гаспадара. То я рады, што ты паслухаўся, не адмовіў мне заглянуць сюды. *(Падыходзіць, абдымае брата)*.

**Свідрыгайла.** Мяне ўжо, лічы, перанялі ў дарозе. Але чаго ты хочаш, кароль?

**Ягайла.** Пабачыць цябе.

**Свідрыгайла.** Не адзін жа дзень сядзеў у цябе вязнем, мог бы...

**Ягайла.** Я не толькі брат табе, але і кароль.

**Свідрыгайла.** Што ж з таго, што брат і кароль? Брат – усё-такі родная кроў. Я ўжо не кажу пра тое, што невядома за што сядзеў столькі ў каралеўскіх лёхах.

**Ягайла.** Цябе не я садзіў. У тваім зняволенні вінаваты Вітаўт і ты сам. Ваша зацятая варожасць прывяла да таго, што аднаго з вас я мусіў нейтралізаваць. Упэўнены, што гэты мой крок – вызваліць цябе цяпер – нашаму стрыечнаму брату не даспадобы будзе. Ён зноў надумаў каранавацца.

**Свідрыгайла.** А што ты? Ты што?

**Ягайла.** Што я? Хіба ж можна, каб у адной бярлозе ды два мядзведзі? Здаецца, нідзе пакуль не чутно было, каб у адной дзяржаве ды два каралі?

**Свідрыгайла.** Няйначай, наш стрыечны брат хоча прыгожа завяршыць сваё праўленне. Таму і палякам тваім некалі прадаўся, дарма што часам паказвае сваю самастойнасць. Да рускіх літвінаў яму ўжо ніякай справы.

**Ягайла.** Ты вось што, Леў!.. Я ж не дзеля таго вызваліў цябе, каб ты браўся за старое! Мы даравалі табе і віцебскія справы, калі ты княжыў там, і чарнігаўскія, і северскія, нават маскоўскія... Ты зразумеў – я цяпер польскі кароль не па адной жонцы-нябожчыцы, у мяне цяпер зяць, дзеці... значыць, дынастычныя справы мне зусім не абыякавыя. Таму я не магу спакойна глядзець на ваш антаганізм з Вітаўтам, таксама як не магу проста глядзець на ягоныя памкненні каранавацца.

**Свідрыгайла.** Ты спрабуеш абвінаваціць мяне ў тым, у чым я яшчэ не замешаны.

**Ягайла.** Я па думках тваіх мяркую. І вось што скажу табе: Вітаўт улады табе не аддасць!

**Свідрыгайла.** Але ж я не магу спакойна глядзець, як вы з ім, з нашым стрыечным братам, прыціскаеце рускую частку княства. Чаго вартая адна Гарадзельская пастанова, згодна з якой усе перавагі аддадзены каталікам?

**Ягайла.** Гарадзельскую пастанову прымаў сейм!

**Свідрыгайла.** Дзе ж тады наш герой Грунвальда быў? Лізаў азадкі палякам? Не думай, што ён цалкам аддадзены табе! Дарэчы, як і ты яму. Думаеш, усе ўжо забылі твае хітрыкі ў перамовах з крыжакамі, калі ты падмануў Вітаўта?

**Ягайла.** Я табе забараняю гаварыць так! А не – дык завярну назад у няволю. *(Бачыць, што па садовай дарожцы набліжаецца каралева. Ледзьве не шэптам)*. Каралева!..

**Соф'я** *(яшчэ здалёку)*. Рада сустрэць цябе, Леў Альгердавіч. Бачу, не дужа змарнеў у каралеўскім астрозе?

**Свідрыгайла** *(цалуе руку каралеве)*. Ды вось...

**Соф'я.** Што вы зноў не падзялілі?

**Ягайла.** Князя Вітаўта.

**Соф'я.** Каб у гэтым уся прычына была?!

**Ягайла.** Каралева, як заўсёды, бачыць ва ўсім больш таго, што ёсць. Ну добра, я тут з садоўнікам займуся, а вы пагаварыце.

*Кароль з садоўнікам зноў пачынаюць разглядваць яблыню. Соф'я падводзіць Свідрыгайлу да садовай лаўкі.*
*Сядаюць.*

**Соф'я.** Бачыла я Вітаўта нядаўна ў Луцку, на з'ездзе манархаў Еўропы. Таксама пастарэў. Але ўсё непакоіцца пра каранацыю. Здаецца-ткі, і гэты раз угаварыў імператара свяшчэннай Рымскай імперыі Сігізмунда. Ну, я рада, што ты на свабодзе!

**Свідрыгайла.** Толькі не разумею вось, чаму мяне кароль вызваліў – ці каб памірыць з Вітаўтам, ці, наадварот, каб усчалася новая варожасць паміж нас?

**Соф'я.** Гэта я прасіла караля, каб вызваліў. Ды хіба ж адна я?

**Свідрыгайла.** Дзякуй, каралева. Але якая прычына змусіла хадайнічаць?

**Соф'я** *(усміхаецца)*. Прычына заўсёды знойдзецца. Але, павер, Леў Альгердавіч, не дзеля вайны з Вітаўтам прасіла. У мяне дзеці нарадзіліся тут – Уладзіслаў і Казімір. Некалі стануць польскімі каралямі. І я ўжо зараз хачу, каб у краіне – і ў самім каралеўстве, і ў Вялікім княстве – у іх былі сябры. Сам жа бачыш, кароль не вечны. Ну а што наконт Вітаўта...

**Свідрыгайла.** Пасля бітвы на Ворксле ён быў пацішэў, а як стаў героем Грунвальда...

**Соф'я.** Падобна, што ты зайздросціш яму, Леў Альгердавіч?

**Свідрыгайла** *(смяецца)*. А што, сапраўды відаць?

**Соф'я.** Ну... Табе не... Словам, цябе не бянтэжыць, што я заву гэтак? Ну, па-руску, ці што?

**Свідрыгайла.** Не.

**Соф'я.** Куды ж цяпер? Месца табе кароль вызначыў?

**Свідрыгайла.** Не. Падамся ў княства. Неяк жа будзе. Тым больш, што там не ўсё ідзе належным чынам. Праваслаўных па-ранейшаму абмяжоўваюць у правах, а што да высокіх пасад, дык... Словам, адпачыў я ў каралеўскім астрозе, цяпер за справу. Добра, хопіць пра мяне. Як вы, ваша каралеўская вялікасць?

**Соф'я.** Жыву ўжо каторы год у Кракаве, а ў сне часта бачу свае Галынаны, найбольш – Друцк, дзе я выхоўвалася ў тамтэйшых князёў. Табе не даводзілася бываць у Гальшанах?

**Свідрыгайла.** Не. Затое ў Друцку гасцяваў не адзін раз. Здаецца ж, брат мой Якаў, цяперашні Уладзіслаў, пасватаў вас там?

**Соф'я.** Так. Ты будзеш чакаць караля?

**Свідрыгайла.** Бадай, мы з ім пра ўсё пагаварылі. Дзякуй за ласку, сястра.

**Соф'я.** Тады вось што, Леў Альгердавіч, ты ў княстве ўсё-такі не стараніся Вітаўта. Я адчуваю – яму таксама нялёгка. Ён – палітык. І гэтаму падпарадкавана ўся ягоная дзейнасць. Я па каралю бачу, як яму часам даводзіцца выкручваць сябе, ісці супраць свайго жадання. І з каранацыяй Вітаўта не ўсё проста. Пра гэта можна здагадвацца.

**Свідрыгайла.** Каго б мне не хацелася бачыць зараз, дык гэта свайго стрыечнага брата.

**Соф'я.** А ты перасіль сябе. У мяне якраз справа да яго ёсць. Я напішу яму ліст, а ты адвязеш у Вільню. Самой мне пакуль туды дарогі няма. Як і ён, здаецца, не збіраецца ў Кракаў.

**Свідрыгайла.** Слова каралевы закон для мяне.

**Соф'я.** Вось і добра. Дзякуй за тваю пакладзістасць, брат. Тады я чакаю сёння на вячэры цябе. Там і ліст атрымаеш.

*Каралева ўстае з лаўкі, падае Свідрыгайлу руку. Той цалуе яе. Разыходзяцца.*

## КАРЦІНА ІІ

*Велікакняскі замак у Вільні. Вітаўт сустракае свайго даўняга ворага, стрыечнага брата князя Свідрыгайлу.*

**Вітаўт** *(да Свідрыгайлы)*. Наколькі я разумею, ты не збіраешся назад у Кракаў?

**Свідрыгайла.** Ты думаеш, што мяне сапраўды цягне туды? Якраз наадварот. Мне цяпер лепей трымацца падалей ад Вільні і ад Кракава.

**Вітаўт** *(смяецца)*. Добра, я не стану прымушаць цябе. Перадам свой ліст да каралевы нейкім іншым шляхам. Дарэчы, яна просіць для цябе месца.

**Свідрыгайла.** Але я пра гэта словам не абмовіўся ёй.

**Вітаўт.** Няважна. Усё роўна месца для цябе ў княстве няма. Але выганяць за межы княства я таксама не стану, хоць здагадваюся, што ад цябе можна чакаць усяго. Ты часам не пацішэў у астрозе?

**Свідрыгайла.** Паразумнеў.

**Вітаўт.** У які ж бок цяпер твой розум скіраваны?

**Свідрыгайла.** Будзем лічыць – гэта тайна. Між тым, па дарозе сюды я наглядзеўся: у княстве мала што змянілася, вялікі князь па-ранейшаму варагуе з рускай знаццю!.. Па-ранейшаму вакол цябе амаль адны католікі. Калі ж настане нарэшце справядлівасць на нашай няшчаснай зямлі?

**Вітаўт.** Вось бачыш? А гаварыў – тайна. З цябе, Свідрыгайла, бойка так і лезе!

**Свідрыгайла.** Не магу маўчаць! Да таго ж твая каранацыя!..

**Вітаўт.** А што табе мая каранацыя? Можа, якраз яе мне і не хапае, каб на нашай няшчаснай зямлі, як ты кажаш, настала справядлівасць?

**Свідрыгайла.** Думаеш, палякі дазволяць табе надзець на галаву карону? Яны смяюцца з цябе!

**Вітаўт.** Не, князь, яны баяцца мяне! Баяцца! Якраз праз гэта і смяюцца. Гэты смех – ад страху. Але я, наперакор усяму, надзену на сябе карону. І калі хто, у тым ліку і ты, стане мне на дарозе, знішчу, сатру ў парашок!

*Нейкі час абодва маўчаць.*

**Свідрыгайла.** Я не хацеў раззлаваць цябе, вялікі князь. Даруй.

**Вітаўт.** Шчырасць за шчырасць. І вось яшчэ, князь, – не лётай па маім Вялікім княстве, не вярбуй сабе прыхільнікаў. Няхай людзі спакойна жывуць, нават калі і незадаволеныя чым.

**Свідрыгайла.** Дазволь мне ехаць у Віцебск.

**Вітаўт.** Я не пярэчу. Толькі не забывай – ты не палітык, Свідрыгайла, табе ў салдатах належала б на бітвы хадзіць, а ты ў палітыку сунешся.

**Свідрыгайла.** Дарэмна ты гэтак, Вітаўт. Успомні, я паўстаў з першых жа сваіх свядомых крокаў за тое, што ты сам некалі адстойваў, а потым занядбаў. Даўно хацеў спытаць: што здарылася, вялікі князь? Хіба табе сапраўды не дарагія запаветы нашых бацькоў?

**Вітаўт.** Яж кажу, ты не палітык, Свідрыгайла. Пакінь мне гэты занятак. Дай часу. Надзену карону... тады... Ды ладна, бывай, князь. Едзь у свой Віцебск. Я напішу туды, каб не чынілі табе перашкод.

**Свідрыгайла.** Дзякуй, вялікі князь. *(Выходзіць)*.

*Вітаўт звоніць у званочак. З другіх дзвярэй да яго заходзіць Чалавек у чорным.*

**Вітаўт.** З гэтай хвіліны твой цень будзе суправаджаць мяцежнага князя паўсюль. Чакаю з падрабязнай справаздачай аб кожным ягоным кроку.

**Чалавек у чорным.** Слухаю, мой гаспадар!..

## КАРЦІНА III

*Кароль Ягайла і кракаўскі біскуп Збігнеў Алясніцкі.*

**Біскуп.** Будзь слаўны Езус Хрыстус наш!

**Ягайла.** Ва векі вякоў!

**Біскуп.** Амін.

**Ягайла.** Маю патрэбу ў падтрымцы душэўных сіл, Біскуп.

**Біскуп.** На ўсё воля Бога.

**Ягайла.** Што ў Вільні?

**Біскуп.** Вітаўт выехаў праведаць свайго зяця ў замку. Там добрыя паляўнічыя ўгоддзі.

**Ягайла.** А яшчэ, біскуп?

**Біскуп.** Брат твой Свідрыгайла ад'ехаў тым часам у Віцебск.

**Ягайла.** Вялікі князь даў яму месца?

**Біскуп.** Не. Напэўна, саслаў туды, каб падалей ад сябе.

**Ягайла.** Так, брат мой няўрымслівы. І можа пашкодзіць каранацыі.

**Біскуп.** Каранацыі не будзе, ваша вялікасць.

**Ягайла.** Гэта ўжо дакладна?

**Біскуп** *(усміхаецца)*. Так. Карона зноў не даедзе да Вільні.

**Ягайла.** Добра, няхай. Хоць іншы раз я думаю сабе, што для Вітаўта карона абернецца звычайнай цацкай. Усё будзе залежаць ад нас. Як мы будзем успрымаць каранаванне.

**Біскуп.** Ваша вялікасць, вы недаацэньваеце небяспеку. Хутчэй за ўсё, што Вітаўт пасля каранацыі закусіць цуглі.

**Ягайла.** Мусіць, так. Ці ж мала мы ўжо бачылі штосьці падобнае? Лепей скажы мне, біскуп, а што яго святейшаства папа, чаму ён не выступае супроць каранацыі?

**Біскуп.** Як я зразумеў са слоў папскага нунцыя, яго святейшаства лічыць гэта чыста польскай і літоўскай справай. Вітаўт таксама ў лоне ягонай царквы.

**Ягайла.** Чаму ж ты, біскуп, у такім разе па-сапраўднаму зацікаўлены ў гэтым?

**Біскуп.** Можа, якраз таму, што гэта чыста польская справа, ваша вялікасць.

**Ягайла.** Дзіўныя справы твае, Госпадзі, да зямлі!

**Біскуп.** На ўсё воля Боская.

**Ягайла.** Ці не паслаць нам новага чалавека ў Будапешт да Сігізмунда?

**Біскуп.** Думаю, што гэта ўжо нічога не дасць.

**Ягайла.** Ну што ж, так таму і быць.

**Біскуп.** Амін. *(Устае з крэсла)*. Будзь слаўны наш Езус Хрыстус!

**Ягайла.** Ва векі вякоў!

## К А Р Ц І Н А IV

*У Віцебску ў адным з дамоў. Тут багатыя рускія, літвіны, баяры, шляхта. Павятовы маршалак прыводзіць у залу Свідрыгайлу.*

**Павятовы Маршалак.** Я вам рэкамендую, панове, дарагога госця. Любіце і шануйце – князь Свідрыгайла, малодшы брат караля Ягайлы і стрыечны брат Вітаўта, сын славутага Альгерда, вялікага князя літоўскага, рускага і жамойцкага.

**Свідрыгайла.** Вітаю вас, слаўныя віцьбічы. Вялікі князь Вітаўт прызначыў мне ваш Віцебск месцам выгнання. Ну а дзе я дагэтуль знаходзіўся, вы, спадзяюся, ведаеце? Чаму пахмурныя? *(Звяртаецца да князя Друцкага).* Князь Іван, не пазнаю цябе!

**Іван Друцкі.** Такое жыццё. Тут не чтолькі спахмурнееш, але счарнееш. Трэба збірацца з сілай. Далей трываць немагчыма – абселі кругом палякі. З веры нашай здзекуюцца. А вялікі князь патурае ім.

**Свідрыгайла.** Бачу, бачу.

**Іван Друцкі.** Дык што надумаў, князь. Як памагчы нашаму гору?

**Свідрыгайла.** Ну а вы? Што вы?

**Адзін з прысутных.** Дайшлі, як кажуць, да ручкі, князь. Няйначай, давядзецца аддзяляцца ад Вялікага княства. Будзем падавацца пад руку маскоўскага цара. Ужо нашы паслы патаемныя там.

**Свідрыгайла.** І хто ж можа адважыцца на такое сёння?

**Адзін з прысутных.** Ды амаль усе рускія валадары. І Глебавічы, і Багавіцкія, і Вяжэвічы, і Друцкія, і Стратовічы... Адным словам, уладальнікі шмат якіх нашых гарадоў – ад Смаленска, Віцебска да Гомеля, Старадуба і Бранска.

**Свідрыгайла.** Гэта ж зямля майго бацькі, вялікага князя Альгерда!

**Адзін з прысутных.** Так, ён нямала павяяваў на гэтай зямлі, але ж, тым не менш, гэта наша спадчына, князь!

**Свідрыгайла.** Яне маю намеру забіраць яе ў вас. Але ці падумалі вы пра лёс Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага?

**Адзін з прысутных.** Князь, радзіма там, дзе лягчэй жывецца.

**Свідрыгайла.** Думаеце, што пад рускім царом будзе лепей?

**Павятовы Маршалак.** Адной жа веры!

**Свідрыгайла.** Мне горка чуць ад вас такое. Выходзіць, бацька мой дарэмна стараўся?

*Усе маўчаць. Свідрыгайла таксама колькі часу маўчыць, тады пачынае гаварыць зноў.*

Мне даводзілася бываць у Маскве. Масква – крывадушная. Канечне, яна рада будзе праглынуць гэтакі кавалак нашае зямлі, але ці стане мацеркай вам?

*Баяры, вайскоўцы, шляхціцы пачынаюць ускокваць.*
*Зала поўніцца галасамі.*

*(Счакаўшы).* Не ведаю, як вам, а мне ваша задума здаецца авантурай. Нам усім трэба дбаць аб адзінстве Вялікага княства, а вы наважыліся на драбненне яго.

**Галасы.** Гэта не мы! Гэта нашы вялікія князі падзялілі нас. Спярша Ягайла са сваёй палячкай, цяпер – Вітаўт! Чаго варта адна Гарадзельская пастанова? Быццам нельга было паўстаць супроць яе?!

**Свідрыгайла.** Я вось гэтак сказаў каралю. А ён мне: маўляў, пастанову прымаў сейм.

**Павятовы Маршалак.** Дзіва што. У сейме ж нашых, рускіх, няма! А калі хто і засядае, то з тых, хто скурвіўся, веру памяняў – праваслаўную на каталіцкую!

**Свідрыгайла.** Ваша права, панове гаспадары. Але ў аддзяленні нашых земляў ад Вялікага княства – не выйсце са становішча.

**Павятовы Маршалак.** Тады скажы, князь, у чым яно?

**Свідрыгайла.** Пакуль у адзінстве княства. І толькі ў гэтым. А далей трэба глядзець. Трэба гэтае пытанне ставіць перад Вітаўтам зноў і зноў – мы тут, у княстве, не выпадковыя людзі, не якія там прышэльцы, а карэнныя жахары, і ўсе прывілеі павінны датычыць як католікаў, так і праваслаўных аднолькава.

**Павятовы Маршалак.** Нашы патрабаванні ад яго адскокваюць, як гарох ад сценкі.

**Свідрыгайла.** Добра, сябры мае, добра. Давайце супакоімся. Давайце паразважаем. Нешта мне здаецца, што вялікі князь неўзабаве пераменіцца. Трэба пачакаць каранацыі.

**Павятовы Маршалак.** Можа, ты, князь, і маеш нейкую рацыю. Але ж малаверагодна.

**Свідрыгайла.** Былі ж у яго некалі добрыя намеры. Ен жа некалі першы сярод нас паўстаў за роўнасць для ўсіх у княстве.

**Адзін з баяраў.** Але ж пасля былі дагаворы і восемдзесят сёмага года і чатырыста першага. Цяпер вось Гарадзельская пастанова...

**Свідрыгайла.** Мне цяжка гаварыць пра ўсё гэта. Але ж самі ведаеце – усё свядомае жыццё я змагаўся за роўнасць у бацькавай вотчыне. І цяпер не пакіну вас. Але давайце дачакаемся каранацыі.

*Зноў у зале ўзнікае шум. Баяры, вайскоўды, шляхдіцы ўскокваюць, нешта крычаць, ажно пакуль не з’яўляецца ганец.*

**Ганец.** Я вам, панове, прывёз страшную вестку... Не стала вялікага князя Вітаўта!..

**Галасы.** Як?! Чаму?!

**Ганец.** Упаў з каня і разбіўся. Але чамусьці адразу счарнеў. Можа, атручаны быў.

*Зала цяжка маўчыць.*

**Павятовы Маршалак.** Ушануем, панове, вялікага Вітаўта! *(Схіляе галаву. За ім – астатнія).* Але не разыходзьцеся. У княстве паўстае пытанне аб новым вялікім князю.

## КАРЦІНА V

**Кракаў.** Вавельскі палац. У караля Ягайлы паслы з Вялікага княства.

**Ягайла.** Шкада, вельмі шкада майго брата Вітаўта. Не дачакаўся ні каранацыі, ні кароны...

**Першы пасол.** Карона спатрэбіцца, ваша каралеўская міласць, другому вялікаму князю.

*Ягайла пільна глядзіць на яго.*

**Ягайла** *(пра іншае)*. Значыць, вы просіце за Свідрыгайлу?

**Другі пасол.** Так, за вашага брата.

**Ягайла.** Але ж на тое, каб Свідрыгайлу стаць вялікім князем, аднаго майго жадання мала.

**Першы пасол.** Ваша вялікасць, мы нізка схіляем перад вамі галовы. Але князя Свідрыгайлу шмат хто падтрымае ў княстве. Асабліва ў Смаленску, Магілёве, Віцебску...

**Ягайла.** Але ж трэба, каб і ў Вільні, Бярэсці, Наваградку... Вялікім князем становяцца, каб быць бацькам усяму княству.

**Другі пасол.** Мы просім за Свідрыгайлу.

**Ягайла.** Я не стану супроць брата. Але ж то найперш ваша справа. Слова – за радай Вялікага княства. За сеймам. Шкада, вельмі шкада князя Вітаўта.

*Паслы ўстаюць з крэслаў. Развітваюцца.*

## К А Р Ц І Н А V I

*У тым жа Вавельскім замку кароль і каралева.*

**Соф'я.** Няхай будзе пахвалёны Езус Хрыстус!

**Ягайла.** Каралева, бачу, хоча стаць большай каталічкай, чым хто іншы ў Польшчы?

**Соф'я.** Пры пераходзе ў каталіцкую веру я давала зарок, Уладзіслаў!

**Ягайла.** Зарок... Усе мы перад кімсьці і некаму альбо нечаму давалі клятву... І ўсе клятвы ператвараюцца, бывае, у звычайную мітусню. Учора хацеў зрабіць так, а сёння... А сёння ты ўжо і сам не той, якім быў учора, і справы нечакана павярнуліся ў зусім адваротны бок...

**Соф'я.** Нешта ты, мой каханы, сёння не ў гуморы?

**Ягайла.** Аднаму ўсявышняму ведамр што такое каралеўскі настрой. Адно прытворства. Лепей скажы, дарагая, як нашы дзеці?

**Соф'я.** Я толькі што бачылася з імі. У Казіка... нешта жывоцік балеў уначы...

**Ягайла.** Спадзяюся, цяпер здаровы?

**Соф'я.** Здаровы, здаровы! А Уладзік адвёў мяне ўбок ад усіх ды кажа: «Чаму бацька не шкадуе цябе?» Гэта ж падумаць толькі, малы, а ўжо непакоіцца пра маці!

**Ягайла.** Ты не псуй мне яго. А то я ведаю вас, кабет. Мне кароль для Полыпчы пасля мяне патрэбны, а не нейкі там...

**Соф'я.** Дарэмна хвалюешся. Выхоўваецца ён, здаецца, як трэба. А што з маці пяшчотны, дык...

**Ягайла.** У мяне спраў багата. Бачыш, колькі папераў на стале. То кажы, чаго прыйшла?

**Соф'я.** Здаецца, у цябе паслы былі з княства?

**Ягайла.** Так, былі. Учора – з каталіцкага боку, сёння – з праваслаўнага. Адны прасілі заступіцца за Вітаўтавага брата Жыгімонта, другія хочуць мецъ за вялікага князя ў Вільні майго брата Свідрыгайлу.

**Соф'я.** А ты?

**Ягайла.** А я і тым і другім сказаў, што іхняя справа. Ім выбіраць вялікага князя, не мне.

**Соф'я.** Чаму тады не памагчы свайму брату? Чаму не ўзяць ягоны бок? Ты ж кароль, маеш уплыў на абедзве дзяржавы? Цябе паслухаюцца!..

**Ягайла.** Справа не ў тым, паслухаюцца ці не. Я свайго брата добра ведаю. Толькі і глядзі, каб не выкінуў нейкае каленка. Хіба ж мала ён ужо навырабляў тых каленак?

**Соф'я.** Малады быў, няўрымслівы. На велікакняскім крэсле аціхне.

**Ягайла.** Баюся, што не. Ен дрэнны палітык. Між тым на месцы вялікага князя якраз і патрэбны найперш палітык.

**Соф'я.** Не ведаю. Але да роднага брата нельга так ставіцца. Усё-такі адна кроў. Паразуменне заўсёды можна знайсці.

**Ягайла.** Але ўва мне, дарагая, ужо і польская кроў ёсць. Няхай што не самым непасрэдным чынам, аднак жа ёсць. Іначай нельга, калі я ўжо сяджу на польскім троне. А ў Свідрыгайлы адна руская кроў. Да таго ж з нядобрай уласцівасцю – надзвычай хутка закіпае. Вітаўт заўсёды быў абачлівы, гэта ён толькі спярша пагуляў у сепаратызм.

**Соф'я.** Думаеш, Жыгімонт будзе лепшым вялікім князем?

**Ягайла.** Каб жа знаць? Але тое, што ён будзе больш згаворлівы, гэта бясспрэчна. Тым часам кажу ж... выбіраць вялікага князя ў Вільні самім літвінам. Мы адкрыта ўмешвацца не станем. *(Устае, цалуе руку каралеве).*

## КАРЦІНА VII

*У прыдворным касцёле Ягайла моліцца. Тут ні людзей, ні ксяндза. Кароль адзін. Неўзабаве да яго далучаецца чалавек, ахінуты ў чорнае, акурат манах. Відаць, што яны знаёмыя. Ягайла ўстае з каленяў, сядае на лаўку.*

**Ягайла.** Што чуваць, чалавеча?

**Чалавек у чорным.** Хвала Госпаду, на дварэ пацішэла. Можна было ехаць.

**Ягайла.** Ну, маладому ў сядле... Я некалі мог праскочыць на добрым кані з паўсотню вёрст за адзін раз. Помню, паслаў мяне бацька, вялікі князь Альгерд, да Менска, дык я толькі адзін раз каня памяняў, а ўвечары ўжо быў на месцы.

**Чалавек у чорным.** Каму ж невядома, што ваша каралеўская міласць выдатны вершнік?

**Ягайла.** О так, чалавеча. Нават не ў пахвалу сабе магу пагадзіцца. Але ж гады цяпер не тыя, каб на злом галавы імчацца. Ну, то апавядай, што чуў, што бачыў сярод людзей?

**Чалавек у чорным.** З людзьмі Вітаўта я ехаў ледзьве не ад самага Будапешта.

**Ягайла.** Чаму з Будапешта? Мне падумалася, што гэтым займаліся ў Рыме?

**Чалавек у чорным.** Не, карону для Вітаўта выраблялі ў майстэрні імператара свяшчэннай імперыі.

**Ягайла.** Зрэшты, няхай. Дык, кажаш, давялося ехаць ажно з Будапешта?

**Чалавек у чорным.** Так.

**Ягайла.** І як? Прыгажэйшая за маю атрымалася?

**Чалавек у чорным.** Здаецца, акурат як і карона польскіх каралёў.

**Ягайла** *(усміхаецца)*. Шкада будзе, калі пашкодзяць яе. Ну ды ладна, пры адсечанай галаве па валасах не плачуць. Як гэта ўсё будзе выглядаць?

**Чалавек у чорным.** Звычайна, на людзей Вітаўта нападуць з засады. Ужо ўсё прадугледжана. На ўсіх дарогах нашы людзі.

**Ягайла.** Але вось што, чалавеча. Гэта добра, што ты ў Кракаў прыехаў. Нам таксама не лішне ведаць, як ідуць справы.

**Чалавек у чорным.** Ну...

**Ягайла.** Вось я і кажу. Гэта добра, што ты да нас прыехаў. Але марудзіць тут няварта. Трэба прасачыць за людзьмі Вітаўта да самых засадаў. І прывезці карону сюды. Зразумеў?

**Чалавек у чорным.** Так, ваша вялікасць.

**Ягайла.** І ніякай сувязі з людзьмі біскупа.

**Чалавек у чорным.** Зразумела, ваша каралеўская вялікасць.

**Ягайла** *(уздыхае)*. Даруй мне, усявышні, грэх мой. Даруй, што рабую. Брата свайго крыўджу. Але падкажы, што мне іначай рабіць? *(Пасля да чалавека ў чорным)*. Ты ідзі, ідзі, чалавеча. Спяшайся, каб не сапсаваць справы.

## К А Р Ц І Н А  V I I I

*Вальны сейм у Вільні. Тут службовыя асобы цэнтральнага і мясцовага кіравання, буйныя феадалы, каталіцкія і праваслаўныя святары, шляхта. Доступ у залу – самы шырокі, дарма што на сейме не ўсе маюць рашаючы голас. Прыхільнікі Свідрыгайлы уносяць яго на руках. Чуюцца крыкі: «Свідрыгайлу вялікім князем, Свідрыгайлу!»*

**Маршалак.** Спакойна, панове, спакойна. Па ранейшай кандыдатуры было вета.

**Чуюцца воклічы:** «Будзем галасаваць! Пачынайце галасаваць!»

**Маршалак.** Усіх правадзейных удзельнікаў вальнага сейму прашу выказацца.

**Галасы.** За, супроць, за, супроць, супроць, супроць!..

**Маршалак** *(глядзіць у залу)*. Такім чынам, галасы супраць пераважылі.

*Зноў воклічы: «Свідрыгайлу, Свідрыгайлу!» – «Далоў Свідрыгайлу!»*

Ціха, панове, ціха! Партыя князя Свідрыгайлы прапануе ў вялікія князі каралеўскага брата Свідрыгайлу.

**Галасы.** А што кароль? Што Ягайла?

**Маршалак.** Кароль, з павагі да яго, ні пры чым тут. Вялікага князя выбірае літоўскі сейм.

**Галасы.** Свідрыгайлу, Свідрыгайлу! Далоў Свідрыгайлу! Заткніце ў дупу свайго Свідрыгайлу!

**Маршалак.** Згодна нашаму даўняму правілу я стаўлю на галасаванне Свідрыгайлу. Выказвайцеся, панове!

**Голас.** Я – супроць! Накладваю вета!

**Маршалак.** Спакойна, панове, спакойна. Пан Плашчынскі выкарыстаў сваё права на вета. Што ж, гэта яго справа. Але мушу папярэдзіць – зацягваць выбранне вялікага князя не мае сэнсу. У княстве павінна быць пераемнасць улады. Мы ўжо спрабавалі галасаваць за некалькіх вялікіх князёў. Цяпер – за Свідрыгайлу. Я прапаную перапыніцца да наступнага дня. Выбранне працягнем заўтра. Да таго ж, нявартa забываць, што на гэтым сейме нам давядзецца вырашаць таксама фінансавыя справы.

*Удзельнікі вальнага сейму – нібыта аднаго гэтага і чакалі – адразу ж натоўпам рушылі з залы пасяджэнняў.*

## К А Р Ц І Н А  I X

*Князь Свідрыгайла мерае крокамі падлогу: туды – сюды, адсюль – туды. З ім у пакоі віцебскі павятовы маршалак, амсціслаўскі ваявода і яшчэ некалькі вайскоўцаў у чынах ротмістраў, харунжых. Яны сядзяць. Заходзіць Шляхціц.*

**Шляхціц.** Сейм пачаўся, князь. Але, як заўсёды, з вялікага шуму-гаму. Пакуль разглядаюць працэдурныя пытанні. Нашы там напагатове. Калі што, дык...

**Павятовы маршалак** *(адказвае замест князя)*. Ну то і мы тут, можна сказаць, наструнены. Чакаем, калі паклічуць.

**Амсціслаўскі ваявода.** Халера яго ведае, можа б, сапраўды князю лепей быць там?

**Павятовы Маршалак.** Няхай, як чалавек кажа, шум-гам сціхне. Прыйдзем, калі ўжо будуць выбіраць вялікага князя. *(Да шляхціца)*. Ты, шляхціц, вяртайся ў сеймавую залу. Ды глядзі, не праваронь галоўнае!

*Шляхціц выходзіць.*

**Амсціслаўскі ваявода.** Учора, князь, мне давялося перакінуцца словам з адным са службоўцаў са світы Вітаўта, які прысутнічаў пры смерці вялікага князя. Аказваецца, Вітаўту ў падарунак мясцовая шляхта каня падвяла. Белага-белага. Ледзьве асядлалі ў двары. Ну, ён і сеў на яго ды адразу ў поле, каб

аб’ездзіць. Прывучыць да сябе. Ну, а конь той трапіўся з непакорным норавам. Вялікі князь не ўтрымаўся ў сядле, разбіўся.

**Свідрыгайла.** Але чаму гэтак счарнеў адразу? Ты на гэта вось адкажы мне, ваявода! Сам жа бачыў вялікага князя ў труне.

**Амсціслаўскі ваявода.** Так, бачыў. Але на тое і жыццё, каб таямніцы пакідаць. Без іх, князь, усё роўна як і нельга. Гэта нашы заўсёдныя спадарожніцы.

**Ротмістр.** Вакол смерці амаль кожны раз нейкія загадкі. Успомніце!.. Ну а тут?.. Ці не звязана Вітаўтава смерць нейкім чынам з каранаваннем? Гэта ж другі раз. Але тады абышлося без трагічных вынікаў.

**Свідрыгайла.** Дарэчы, а як цяпер? Дзе карона, якую Вітаўту павінны былі прывезці?

**Ротмістр.** Кажуць, на канвой нападзенне было. Нібыта пасеклі яе.

**Павятовы Маршалак.** Сапраўды, здаецца, так. Але то, можа, проста чуткі?

**Свідрыгайла.** Вельмі хацелася яму гэтай кароны!.. У размове са мной, якая адбылася ў нас апошні раз у Вільні, ён не хаваў гэтага.

**Амсціслаўскі ваявода.** Ды мы ўсе ў княстве чакалі каранацыі. Як ні кажы – дзяржаўная справа.

**Свідрыгайла.** Штосьці пэўнае ён звязваў з каранацыяй. Намёкі нават рабіў, але я тады падумаў... Словам, што цяпер гаварыць?

**Павятовы Маршалак.** І ўсё-ткі!..

*Зноў заходзіць той жа Шляхціц. Разводзіць рукамі.*

**Амсціслаўскі ваявода** *(амаль з трывогай)*. Што?

**Шляхціц.** Шум ды гам. Ажно вушы вянуць.

**Амсціслаўскі ваявода** *(смяецца)*. Няхай сабе пачмурэюць трохі.

**Шляхціц.** Але сёй-той не паспеў яшчэ і апахмяліцца з учарашняга.

**Амсціслаўскі ваявода.** Відаць, не без таго. *(Да князя Свідрыгайлы, няйначай, каб падбадзёрыць)*. Га, князь?

*Свідрыгайла ў адказ смяецца, але насцярожана.*

Ты ідзі, шляхціц, ідзі. Вяртайся на сваё месца.

*Шляхціц выходзіць.*

**Свідрыгайла** *(да павятовага маршалка)*. Гэтае тваё – і ўсё-ткі... ваявода... Я вось думаю. Ці не хацеў ён павярнуцца тварам зноў да ўсходняй часткі нашага княства? Ці не хацеў ён вярнуцца да сваёй ранейшай палітыкі?

**Павятовы Маршалак.** Можа. Але ж надта надоўга ён занядбаў яе.

**Свідрыгайла.** Мяне і гэта цікавіць. Чаму?

**Павятовы Маршалак.** Таксама загадка, князь. Няйначай, з чымсьці звязана.

**Амсціслаўскі ваявода.** А пачалося ўсё з бітвы на Ворксле. Ен тады адразу неяк ахляў. І нават героем па-сапраўднаму не адчуў сябе пасля Грунвальда.

**Свідрыгайла.** Ен мяне папракаў неяк, што я не выйграў ніводнай бітвы. Але ж сам... Ці то ён тады хана Тахтамыша падбухторваў на яе, ці, можа, той.

**Амсціслаўскі ваявода.** Малады быў, амбітны.

**Павятовы Маршалак.** Ды ён і ў сталыя гады не менш амбітны быў.

**Свідрыгайла.** Але трэба аддаць яму належнае. Дзяржаву сваю ён імкнуўся зрабіць вялікай. Яму мала было таго, што меў. Кажуць, ажно ўкленчваў перад апальным ханам Тахтамышам: «Ты пасадзі мяне, маўляў, на Маскоўскім вялікім княжанні... і на Ноўгарадзе Вялікім, і на Пскове, а Цвер і Разань і так мае, Немца і сам вазьму... А цябе я пасаджу на Ардзе і на Сараі, і на Балгарах, і на Астрахані, і на Азове, і на Ардзе...»

**Павятовы Маршалак.** Такога вялікага царства нават у імператара Сігізмунда няма! Але Цімур-Кутлук з Эдыгеем перашкодзілі ажыццявіць грандыёзныя планы.

**Свідрыгайла.** Аказваецца, бітвы ўсё вырашаюць. Тут выходзіць так: альбо ідзі на яе, альбо не. І заўсёды быццам з завязанымі вачамі. Вось і Вітаўт, царства яму нябеснае.

*Заходзіць усё той жа Шляхціц.*

**Шляхціц.** Зноў наваградскі дэлегат са сваім ветам!.. Сейм хоча бачыць вас, князь!

**Свідрыгайла.** Бачыце, у нас часам бывае, што і адзін у полі воін. Не дазволю, і ўсё там! Але хадземце, панове, у сеймавую залу. Хопіць тут марнець!

*Свідрыгайла, за ім амсціслаўскі ваявода, павятовы маршалак, ротмістры і харунжыя заходзяць у сеймавую залу. Наваградскі дэлегат крычыць яшчэ насустрач: «Мяне ўгаворваюць твае прыхільнікі, князь, зняць вета на тваю карысць. А скажы-тка, князь, як ты будзеш кіраваць княствам? Каго будзеш слухацца – паноў-рада з захаду ці ўсходу? Католікаў ці праваслаўных?» Свідрыгайла выходзіць на сярэдзіну і спыняецца каля маршалка сейма.*

Я, панове дэлегаты, пачну з таго, што аднаўлю справядлівасць, якая даўно парушана ў княстве. У Раду дапушчу таксама людзей з усходняй часткі княства. Дагэтуль іх не было ў Радзе. А слухацца буду адных і другіх. Хачу справядлівасці для ўсіх – для католікаў і для праваслаўных!.. Для...

*Крычаць: «Свідрыгайлу ў вялікія князі, Свідрыгайлу!» – «Далоў Свідрыгайлу!»*

**Маршалак.** Пан наваградскі дэлегат задаволены адказам князя Свідрыгайлы?

*Адразу некалькі галасоў: «Задаволены, задаволены!»*

Тады выказвайцеся – хто за, хто супроць. Пан навäградскі дэлегат, пачнем з вашага канца. Хто за тое, каб князю Свідрыгайлу быць вялікім князем на Літве, на Русі і Жамойціі?

**Галасы.** За Свідрыгайлу, за Свідрыгайлу... Супроць!.. За Свідрыгайлу, за Свідрыгайлу... Супроць!.. За Свідрыгайлу, за Свідрыгайлу...

**Маршалак** *(выцірае рукавом пот з ілба, тады звяртаецца да Свідрыгайлы, які ўсё яшчэ побач).* Ну, хвала Богу, гэты раз, здаецца, выбралі вялікага князя. Я віншую вас, Леў Альгердавіч!..

# ЧАСТКА ДРУГАЯ

## К А Р Ц І Н А X

*Вялікі князь Свідрыгайла і Жыгімонт Кейстутавіч, брат нябожчыка Вітаўта.*

**Свідрыгайла.** Ты, князь, не турбуйся. Памяць аб тваім браце захаваецца. Пры ім жа мы атрымалі выхад да Чорнага мора. Не хто іншы, а ён, Вітаўт, апошні раз заваяваў Смаленск. Менавіта ён пашырыў нашы абшары да такіх межаў, пра якія, можа, нават мой бацька, вялікі Альгерд Гедымінавіч, не марыў. Хоць як сказаць?..

**Жыгімонт.** Твой бацька ды мой бацька разам мала не заваявалі ўсю Масковію.

**Свідрыгайла.** Нам з табою, мой добры Жыгімонт, лепей будзе глядзець за пасягальніцтвам чужынцаў на захадзе.

**Жыгімонт.** Захад наш кароль з Вітаўтам, здаецца, надоўга супакоілі. Крыжакі цяпер на штосьці большае не адважацца.

**Свідрыгайла.** Гэта тут, у сярэдзіне княства, а з боку Рыгі яны ўвесь час пагражаюць.

**Жыгімонт.** Малыя непаразуменні на сумежках дзяржаў заўсёды здараюцца.

**Свідрыгайла.** Ладна, што ты маеш да мяне? Чаго прыйшоў, брат?

**Жыгімонт.** Паразумецца. Душой паразумецца. Як, бывала, рабілі гэта твой бацька Альгерд ды мой бацька Кейстут, твой брат Ягайла ды мой брат Вітаўт.

**Свідрыгайла.** Так, прыклад для нас, здаецца, ёсць. Але я ўсё думаю, чаму Вітаўт гэтак слухаўся Ягайлу ў пытаннях польска-літоўскіх адносін?

**Жыгімонт.** Хіба ж па адной нашым дзяржавам можна было выжыць? З захаду крыжакі, з усходу не менш хцівая Масковія!..

**Свідрыгайла.** Тады навошта ва ўсіх апошніх дагаворах паміж дзвюма дзяржавамі перавагі аддаваліся людзям каталіцкага веравызнання? Чаму праваслаўная знаць гэтакімі прывілеямі не карысталася?

**Жыгімонт.** Чаму, чаму? Ды гэтых «чаму» – мноства! Іх пералічыць цяжка будзе, калі пачаць.

**Свідрыгайла.** Але ж і цябе, брат, на вальным сейме падтрымлівалі на вялікакняскі стол найбольш каталікі!..

**Жыгімонт.** Ці варта цяпер згадваць, хто ды каго падтрымліваў? Як я разумею, пры новым вялікім князю ў нас будзе іначай?

**Свідрыгайла.** Так, прывілеі для прадстаўнікоў каталіцкага веравызнання павінны быць адменены. У княстве павінны быць усе роўныя.

**Жыгімонт.** Трэба падумаць...

**Свідрыгайла.** І яшчэ. Калі твае прыхільнікі не падтрымаюць маё пачынанне, давядзецца ўжываць крутыя меры.

**Жыгімонт.** Зацятасць нядобры дарадчык, вялікі князь.

**Свідрыгайла.** Думаеш, у зацятасці справа? Ды мяне, калі хочаш, хопіць на ўсё! Я гатовы хоць зараз распасцерці сваю душу ад Бярэста да Смаленска і ад Вільні да Амсціслава і далей. А вось брат твой, выходзіць, няздольны быў на гэта, дарма што якраз ягонымі намаганнямі змацавана і пашырана бацькава спадчына. Значыць, справа не ў зацятасці. Справа – у душы, як яна ў цябе настроена, на які лад. А мая душа якраз і імкнецца абняць увесь наш абшар, усё княства.

**Жыгімонт.** Некалі ў нас у адзін час былі два вялікія князі. Не антаганісты, а аднадумцы. Твой бацька і мой. Удвух кіравалі княствам.

**Свідрыгайла.** Ці не хочаш ты прапанаваць і мне штосьці падобнае?

**Жыгімонт** *(усміхаецца)*. Не, гэта так, да слова. Я пакуль не навязваюся табе ў сукіраўнікі. А вось аднадумцам тваім хацелася б стаць.

**Свідрыгайла.** Што ж табе перашкаджае?

**Жыгімонт.** Здаецца, нішто.

**Свідрыгайла.** Але што значыць гэтае тваё «пакуль»?

**Жыгімонт.** Проста абмовіўся. Але павер, я сапраўды рады бачыць цябе на троне ў нас! Не забывай, Леў, што ў цябе ёсць таксама брат Жыгімонт. *(Выходзіць)*.

## К А Р Ц І Н А  X I

*Да Свідрыгайлы заходзіць Праваслаўны біскуп.*

**Свідрыгайла.** Як думаеш, біскуп?

**Праваслаўны біскуп.** Вялікі князь падганяе мае думкі?

**Свідрыгайла** *(смяецца)*. Не. Проста хачу ведаць як найхутчэй тваю думку, біскуп, пра новую Раду.

*Біскуп усаджваецца ў крэсла насупраць вялікага князя.*

**Праваслаўны біскуп.** Пра новую найвышэйшую Раду?

**Свідрыгайла.** Так.

**Праваслаўны біскуп.** Найперш, мне здаецца, варта падумаць пра сейм.

**Свідрыгайла.** Ну і пра сейм. Але пра найвышэйшую Раду Вялікага княства найперш.

**Праваслаўны біскуп.** Галоўнае, што паны-рада – таксама нашы людзі. З Віцебска, Полацка, Смаленска, Магілёва, Амсціслава... Нарэшце, з Бранска, Чарнігава, Гомеля...

**Свідрыгайла.** Так, так, Біскуп. Трэба, каб у сейме было два біскупы – каталіцкі і праваслаўны. З Віцебска мне пішуць, што там пачынае варушыцца прапольская знаць.

**Праваслаўны біскуп.** Чаго ж ты хацеў, вялікі князь? Каб перамены ў княстве з тваім прыходам да ўлады адбыліся самі па сабе?

**Свідрыгайла.** Ну, не так, каб ужо самі па сабе. Але ж...

**Праваслаўны біскуп.** Кажуць, да цябе, ваша міласць, прыходзіў Жыгімонт?

**Свідрыгайла.** Так.

**Праваслаўны біскуп.** І пра што вы бяседу вялі?

**Свідрыгайла.** Мы не дагаварылі. Не сказалі, напрыклад, пра тое, чаму ўсе унн. якія заключаліся дагэтуль паміж Польшчай і Вялікім княствам, былі такія аднабокія? Гэта ж падумаць адно: па Гарадзельскай пастанове не дазвалялася каталікам жаніцца з праваслаўнымі. І наадварот. Што гэта значыць?

**Праваслаўны біскуп.** Хіба, можа, тое, што некалі праваслаўны Ягайла ажаніўся з каталічкай Ядвігай.

**Свідрыгайла.** Думаеш, у адпомсту?

**Праваслаўны біскуп.** Ды не. Тут усё глыбей. Ды вялікі князь і сам ведае.

**Свідрыгайла.** Не ўсё дагаварылі мы і пра нашых з ім братоў – Вітаўта і Ягайлу. Дапусцім, Вітаўт быў мне няродны брат. Але ж Ягайла? Мы ж, і Вінгальт, і Скіргайла, і я, і ён, адной маці дзеткі – віцебскай княгіні Марыі Яраслаўны.

**Праваслаўны біскуп.** Так, бацька твой Альгерд ажаніўся з Марыяй, калі княжыў у Віцебску. Яшчэ да таго, як стаць вялікім князем.

**Свідрыгайла.** Дык чаму тады міру паміж намі не было? Мала майму старэйшаму брату зняволення ў кракаўскіх лёхах аднаго Скіргайлы, дык ён і мяне загадаў пасадзіць туды? Ды патаемна, па просьбе Вітаўта, можа, не ўсе і ведаюць у княстве пра такое злачынства?

**Праваслаўны біскуп.** Тут таксама ўсё зразумела. Для Вітаўта вы з братам Скіргайлам заўсёды былі сапернікамі. Ды і не хавалі вы гэтага.

**Свідрыгайла.** Але ж Якаў чамусьці кожны раз браў Вітаўтаў бок?

**Праваслаўны біскуп.** Ягайла з Вітаўтам – палітыкі.

**Свідрыгайла.** Вось і мне Якаў пра гэта маўляў, ты не палітык, ты!..

**Праваслаўны біскуп.** Палітыка не заўсёды чыстая справа, вялікі князь. А ты – чысты, ты светлы, ты змагар за справядлівасць, ты – Леў.

**Свідрыгайла.** Але ж сёй-той мяне якраз за гэта папракае. Нібыта вялікі князь мусіць забыць на троне пра сумленне, пра душу. А што мой старэйшы брат зрабіў з Вінгальтам?

**Праваслаўны біскуп** *(уздыхае)*. Так, Андрэю Альгердавічу таксама давялося пакутаваць...

**Свідрыгайла.** Цікава, як гэта Вітаўту ўдалося ўцягнуць яго ў бойку з татарамі на Ворксле? Там, небарака, і загінуў...

**Праваслаўны біскуп.** Але ж князь Андрэй паслужыў праваслаўным у Масковіі і на Куліковым полі?

**Свідрыгайла.** Так, чалавек ён быў адважны і рызыкоўны.

**Праваслаўны біскуп.** Усе вы, Альгердавічы, адважныя і рызыкоўныя. Але хіба ж без гэткіх вашых якасцяў наша Вялікае княства магло распасцерціся ад мора да мора? *(Устае з крэсла, хрысціць Свідрыгайлу. Тады спахопліваецца).* Загаварыў ты мяне, вялікі князь, нават забыў, чаго прыехаў.

**Свідрыгайла.** Цяпер успомніў?

**Праваслаўны біскуп.** Так, успомніў. Вось ты казаў пра Гарадзельскую пастанову. Там сапраўды ёсць месца, дзе забараняецца мець змешаныя сем'і па веры. Аднак што рабіць цяпер? Князь Менскі просіць дазволу на жаніцьбу свайго сына з дачкой слонімскага харунжага.

**Свідрыгайла.** Яна – каталічка?

**Праваслаўны біскуп.** Так.

**Свідрыгайла.** Ну то давайце пажэнім. Пагавары з каталіцкім біскупам. А там, можа, і я ажанюся з якой-небудзь прыгожай каталічкай? *(Смяецца).* Вядома, з літвінкай.

**Праваслаўны біскуп** *(таксама ўсміхаецца).* Глядзі, Леў Альгердавіч. Можа, недзе ў іншым баку трэба пашукаць жонку? А то ў вас ужо адзін з братоў ажаніўся з каталічкай.

*І Свідрыгайла і праваслаўны біскуп смяюцца з гэтых слоў, як з дасціпнай выдумкі. Біскуп зноў хрысціць вялікага князя. Той цалуе біскупу руку. Разыходзяцца.*

## К А Р Ц І Н А  Х І І

*Вялікі князь і вайсковец у чыне ротмістра.*
*Апошні – стаіць.*

**Свідрыгайла.** Хочацца ведаць, ротмістр, як было ўсё. Вы раскажыце падрабязна – дзе, калі і як?

**Ротмістр.** Слухаю, вялікі князь.

**Свідрыгайла.** Але перад тым, як пачнеце, я дадам. Справа ў тым, што карона, якую везлі вы з Будапешта ў Вільню, не толькі маёмасць аднаго нябожчыка Вітаўта. У асобе Вітаўта, з яго каранацыяй і гэтак далей, мелася на ўвазе ўсё княства. Ад Вітаўта карона павінна была потым пераходзіць да іншых вялікіх князёў.

**Ротмістр.** Разумею, вялікі князь.

**Свідрыгайла.** Ну, то апавядай.

**Ротмістр.** З Будапешта мы выехалі досвіткам. Але ў Венгрыі нічога падазронага не заўважылі. Невядомыя постаці пачалі траплялцца многа пасля. Ужо ў самой Польшчы. Усе мы ведалі пра няўдалую спробу прывезці ў Вялікае

княства карону ў дваццаць дзевятым годзе. Таму ехалі па каралеўстве ўвесь час насцярожана. І вось паміж...

**Свідрыгайла.** Ну, гэта вядома дзе. Давай, калі ласка, далей.

**Ротмістр.** Слухаю, вялікі князь. Але я хацеў сказаць, што пасля Торуні...

**Свідрыгайла.** Чаму вы раптам падаліся да Торуні? З Венгрыі ж ёсць карацейшыя дарогі.

**Ротмістр.** Нам параілі ехаць так.

**Свідрыгайла.** Хто?

**Ротмістр** *(паціскае плячамі)*. Не помню ўжо, ваша вялікасць.

**Свідрыгайла.** Ну, як гэта можа быць? Везці такую каштоўную рэч і слухацца абыкаго! Вы што, маршруту не намячалі папярэдне?

**Ротмістр.** Абгаворвалі з вялікім князем, але... Пачалі гэтыя цёмныя постаці шнырыць вакол, стала боязна. Ну, не тое, што боязна, проста вырашылі мы больш пільнымі быць. А тут пасля Торуні, на трэці дзень, і напалі нейкія ўзброеныя людзі на наш канвой. Падначаленых маіх пасеклі шаблямі адразу, а мяне звязалі. Нават не ведаю чаму. На маіх вачах і з кароны пачаўся здзек. Спярша гаварылі брыдкія слова, а тады ўзялі з сабой пасечаную шаблямі карону і зніклі.

**Свідрыгайла.** Ты мог бы пазнаць іх цяпер?

**Ротмістр.** Здаецца, не. Хоць вочы яны мне і не завязалі, але твары іхнія я не запомніў.

**Свідрыгайла.** Ну а так?.. Што за людзі былі? Палякі?

**Ротмістр.** Не ведаю, вялікі князь. Але крычалі і размаўлялі па-польску.

**Свідрыгайла** *(раздумліва)*. М-так, Ротмістр. Гэта па вашай віне княства пазбаўлена кароны!

**Ротмістр.** Вінаваты, ваша вялікасць.

**Свідрыгайла.** Але я паклікаў цябе не дзеля пакарання. Хацелася паслухаць, каб супаставіць сякія-такія здагадкі.

**Ротмістр.** На жаль, я мала чым магу быць карысны вам. Хоць і быў усю дарогу напагатове, але не здолеў выканаць як след даручэнне Вітаўта. Ды і вас, ваша вялікасць, выходзіць, падвёў: пазбавіў кароны!..

**Свідрыгайла.** Выходзіць, выходзіць, шаноўны.

**Ротмістр.** Ваша вялікасць, паколькі я ўсведамляю сваю віну, дазвольце мне пакінуць службу?

**Свідрыгайла.** Ты так вырашыў? Канчаткова?

**Ротмістр.** Так.

**Свідрыгайла.** Я разумею цябе, Ротмістр. А найбольш разумею, што адбылося. Над гэтай нашай каронай усё роўна як праклён. Нават цяжка рашыцца, ці рабіць далейшыя захады? Ці пасылаць па карону трэці раз?

## КАРЦІНА XIII

*На аўдыенцыі ў вялікага князя літоўскага, рускага і жамойцкага. У доўгай зале Свідрыгайла абыходзіць прысутных. Размаўляе.*

**Свідрыгайла** *(да аднаго з прысутных)*. Помню, помню, князь Канстанцін. Абяцаў. Зраблю. Сына твайго вазьму на службу. Як княгіня? Ну, слава Богу. Я не забуду. Хутка паклічу сына твайго. Няхай пакуль на лузе шабляй лазу сячэ. *(Да другога з прысутных)*. На што, пане каханы, скардзішся? Дзіўна, няма скаргаў? Ну то і добра. Ах, вось што! Прыехаў павіншаваць вялікага князя з выбраннем? Дзякуй, дзякуй! *(Да трэцяга з прысутных)*. Нешта я не ведаю вас. Ах так, цяпер прыгадваю, ваш бацька некалі служыў у мяне. Так, у Чарнігаве. І ў Ноўгарадзе-Северску. Канечне ж, далёка. Але што зробіш, зямля наша далёка і шырока распасцёрлася. Чым магу быць карысны? Ну, гэта мы хутка ўладзім. Я вось загадаю зараз, і вашу справу возьмуць у суд. Перадавайце бацьку, што я помню яго. *(Нарэшце да чацвёртага з прысутных)*. Бачу, бачу, малады князь. Што ў вас у Менску чуваць? Нічога? Ну як гэта можна, каб у такім выдатным горадзе ды нічога не чуваць было? Ну так, так, я помню. Мне біскуп гаварыў пра цябе. Як нявеста, як бацькі яе? Згадзіліся выдаць каталічку за праваслаўнага? А то я магу пайсці ў цябе за свата! Ладна, я віншую цябе, раз ужо ўсё зладжана. Не забудзь паказаць нявесту. Ну-ну, я віншую, князь, і вельмі рады за вас абаіх – за цябе і за нявесту. *(І яшчэ да аднаго з прысутных)*. Ведаю, ведаю. Вы па судовай справе. Колькі ж цягнецца яна? Вунь яно што! За гэткі час можна было два разы нарадзіцца і два разы жыццё пражыць. Мне казалі, што вы адмовіліся ўнесці належную суму ў суд? Не зусім так? Добра, я зноў пацікаўлюся вашай справай.

## К А Р Ц І Н А  X I V

*Кароль польскі і Жыгімонт, брат вялікага князя Вітаўта.*

**Жыгімонт.** Але ж, ваша вялікасць, Свідрыгайла парушае амаль усе параграфы Гарадзельскай пастановы!

**Ягайла** *(змрочна)*. Выходзіць, так.

**Жыгімонт.** І сваімі паводзінамі на кожным кроку знарок паказвае сваю нязгоду з парадкамі, заведзенымі Вітаўтам?

**Ягайла.** І пра гэта мы чулі. Я заўсёды ведаў, што мой малодшы брат чалавек авантурнага характару. Бяда ў тым, што ён мала калі задумваецца над вынікамі, якія могуць быць пасля кожнага ўчынку, кожнай падзеі. Я ўжо не кажу, што ён і не палітык, і не... Словам, вы там, у Вільні, самі выбралі сабе вялікага князя.

**Жыгімонт.** Пасля пахавання Вітаўта ў княстве панавала эйфарыя. Здаецца, так гэта завецца?

**Ягайла.** Назву хоць якой з’яве можна падшукаць. Справа не ў назве, дарагі мой. Справа ў тым, што яшчэ пры Вітаўту штосьці падобнае пачало наспяваць. Брат твой вельмі заняты быў каранацыяй. Нічога іншага ўжо не хацеў чуць.

**Жыгімонт.** Так, ён дужа хацеў надзець на сябе карону. Тут нічога не скажаш. Але ж Свідрыгайла, няйначай, таксама марыць аб кароне?

**Ягайла.** Мусіць, аднак я вось пра што думаю. Ці не паспрабаваць нам пераняць сёе-тое з часоў, калі на чале Вялікага княства стаялі нашы бацькі: твой бацька – Кейстут і мой – Альгерд?

**Жыгімонт.** У адным княстве...

**Ягайла.** Што тут дзіўнага? Нашы бацькі нядрэнна ўладарылі, нядрэнна дапаўнялі адзін аднаго. Тут і вынікі былі. Дай Бог нам захаваць іхнюю спадчыну.

**Жыгімонт.** Але як ажыццявіць гэта?

**Ягайла.** Вось тут галоўнае. Неабходна давесці маю думку да Свідрыгайлы. Толькі асцярожна. А то ён адразу ўзбурыцца, як наравісты конь. Я напішу яму ліст. А ты адвязеш у Вільню. Аднак ведай – пасля таго, як ліст прачытае Леў, забярэш назад, каб вярнуць мне. Зразумеў?

**Жыгімонт.** Так. Але ж...

**Ягайла.** Калі з кожнага поваду сумнявацца, то навошта тады наша жыццё? Бывай. Каралева прасіла, каб накіраваў цябе да яе. Тым больш, што я запрасіў сёння біскупа. Ну, бывай, брат Жыгімонт.

## КАРЦІНА XV

*Кароль і кракаўскі біскуп Збігнеў Алясніцкі. Яны ў тым жа пакоі, дзе Ягайла прымаў свайго стрыечнага брата князя Жыгімонта.*

**Біскуп.** Будзь слаўны Езус Хрыстус наш!

**Ягайла.** Ва векі вякоў.

**Біскуп.** Амін.

**Ягайла.** Відаць, мала апошнім часам малюся, Біскуп. Чамусьці каторую ноч сніцца небарака Вітаўт.

**Біскуп.** Дзіўна. Але ж, мой кароль, сны – гэта не што іншае, як вынік жыццёвых згрызотаў.

**Ягайла.** Але чаму ён у гэтакім выглядзе стаў з'яўляцца мне ў сне? Увесь час, як бачу яго, мой стрыечны брат падае мне на рукі. Я адступаюся, а ён падае, быццам шукае падтрымкі.

**Біскуп.** Можа, сапраўды шукае, гледзячы на тое, што робіцца пасля яго ў княстве.

**Ягайла.** А я, біскуп, пра іншае падумаў.

**Біскуп.** Слухаю, ваша вялікасць.

**Ягайла.** Так, так, паслухай, Біскуп. Дык я вось пра што падумаў. Мы не маем якога-небудзь дачынення да смерці вялікага князя?

**Біскуп.** Як вас разумець, мой кароль?

**Ягайла** *(упарта глядзіць на Алясніцкага)*. А так і трэба разумець. Адна справа пазбавіць чалавека кароны, зусім іншая – жыцця? Таму я і пытаюся ў цябе, біскуп!.. Твае ж людзі, няйначай, паспелі пацікавіцца гэтым?

**Біскуп.** Так, мае людзі былі ўжо на месцы здарэння. Гаварылі і з дворняй ягонага зяця, і са слугамі, і з аховай. Вітаўт, па ўсім, памёр сам ад моцнага ўдару аб зямлю. Не вытрымала сэрца. Казалі, што ён скардзіўся на грудзі ў той дзень.

**Ягайла.** Значыць, як дуб-волат, упаў і разбіўся?

**Біскуп.** Так, ваша вялікасць.

**Ягайла.** Але ж... Свідрыгайла, мабыць, таксама будзе высвятляць прычыны смерці свайго папярэдніка? Калі ўжо, вядома, не паслаў туды людзей?

**Біскуп.** Хутчэй за ўсё, што так. Але ні вам, мой кароль, ні мне няма чаго трывожыцца: Вітаўт сам памёр.

**Ягайла.** Тады скажы, біскуп, чаму ён гэтак раптоўна счарнеў? Мне даносілі, што ажно цяжка пазнаць было?

**Біскуп.** Так, мой кароль. Вітаўт чамусьці адразу счарнеў. Але дактары тлумачаць, што падобнае з людзьмі здараецца. У медыцынскай практыцы такое сустракаецца незалежна ад чыйго-небудзь умяшання.

**Ягайла** *(усё роўна як з палёгкай уздыхае)*. Але ж гэтыя сны!..

**Біскуп.** Таму што вы прынялі смерць вялікага князя моцна да сэрца.

**Ягайла.** Хіба што...

**Біскуп.** З княства прыходзяць скаргі ад нашых аднавернікаў. Свідрыгайла падвяргае ганенню каталіцкую царкву.

**Ягайла.** Можа, каталікам толькі здаецца? У іх жа вунь якія дагэтуль прывілеі былі? Наўрад ці дазволіць мой малодшы брат здзек!.. Няйначай, так ён сабе ўяўляе справядлівасць.

**Біскуп.** Няхай яго наставіць на разумны шлях усявышні! *(Як і заўсёды, біскуп кладзе рукою крыж паміж сабой і каралём. Выходзіць).*

## К А Р Ц І Н А  X V I

*Свідрыгайла і князь Жыгімонт ходзяць перад велікакняскім замкам.*

**Свідрыгайла** *(прачытаўшы ліст, які даў яму Жыгімонт)*. Цікава, адкуль у майго брата, караля польскага, такія выдумкі ў галаве з'явіліся?

**Жыгімонт.** Было ж падобнае ў гісторыі нашага княства. Напрыклад, у часе нашых бацькоў, твайго і майго.

**Свідрыгайла.** Але ж іхнія дзеці, Якаў і Вітаўт, княжылі пасля па адным? Тады навошта цяпер выдумляць, што ў княстве чавінны быць два вялікія князі? Не, на гэта маёй згоды не будзе!

**Жыгімонт.** Як ведаеш. Але кароль прасіў, каб я вярнуў гэты ліст яму.

**Свідрыгайла.** Не хоча ў гісторыю трапляць са сваёй выдумкай? Ад гісторыі ўсё роўна не схаваешся!.. Яна такая!.. Няхай, бяры каралеўскі ліст. *(Падае Жыгімонту ліст).* Але скажы мне, мой стрыечны брат Жыгімонт, гэта, выпадкам, не ты займеў ахвоту стаць другім вялікім князем? не ты прасіў караля?

**Жыгімонт.** Маё жаданне – гэта маё жаданне. Але караля я не прасіў.

**Свідрыгайла.** І на тым дзякуй. Тады скажы, чаму ў караля ўвогуле з'явілася думка аб падзеле ўлады ў княстве?

**Жыгімонт.** Ад нас у Кракаў ідзе багата скаргаў. Я таксама скажу табе, а ты ўжо як хочаш. Ты перагрузіў нашу лодку, якая завецца Вялікім княствам Літоўскім...

**Свідрыгайла** *(дадае)*. Рускім і Жамойцкім.

**Жыгімонт.** Так, Рускім і Жамойцкім. Дык ты вельмі перагрузіў нашу лодку праблемамі, якія маглі б, ва ўсякім выпадку, пачакаць.

**Свідрыгайла.** Пра якія ты праблемы, брат?

**Жыгімонт.** Іх сапраўды багата. Але самая галоўная, ужо сёння відаць, у так званай роўнасці ўсходняй і заходняй частак княства, дакладней, паміж каталіцкай і праваслаўнай часткамі насельніцтва, у першую чаргу – паміж знаццю. А тым часам у нашай федэрацыі жывуць не толькі праваслаўныя ці католікі.

**Свідрыгайла.** Вось як ты загаварыў?! А твой брат Вітаўт пра іншых насельнікаў нашага княства і не ўспамінаў! Яму галоўнае былі літвіны-католікі, якія гатовы назвацца палякамі.

**Жыгімонт.** Кожны называе сябе так, як хоча.

**Свідрыгайла.** Тады чаму прывілеі даваліся толькі адным?

**Жыгімонт.** Ды таму, што нам заўсёды пагражае экспансія з усходу!

**Свідрыгайла.** А я лічу, што і з захаду, ад той жа Польшчы!

**Жыгімонт.** З каралеўствам мы заўсёды паладзім. Тым больш, што цяпер і кароль там літвін. А далей – на польскім троне будуць ягоныя сыны. Таксама, лічы, літвіны. Маці ў іх літвінка і бацька літвін.

**Свідрыгайла.** Ну, наконт бацькі яшчэ паваражыць трэба.

**Жыгімонт.** Не нам з табой гэта высвятляць. Але не крыўдуй, брат, калі я цябе папярэджу. Не раскалыхвай нашу лодку, а то трапіш на порах.

**Свідрыгайла.** Уладары заўсёды знаходзяцца на пораху. Тут важна, ці падпалены кнот. Цікава таксама ведаць, хто яго наважыцца запаліць. Можа, ты, брат?

**Жыгімонт** *(не адказвае, пра іншае)*. Дык што будзеш пісаць каралю?

**Свідрыгайла.** А нічагусенькі. Пражыву без ягоных падказак.

**Жыгімонт.** Але ж ён па нараджэнні мае права радзіць нам, сваім братам і сёстрам.

**Свідрыгайла.** Ну, сёстрам няхай. А вялікаму князю?! Добра, Жыгімонт, будзем лічыць, што мы пагаварылі. Я не сярдую на цябе. Толькі зразумей – мы дужа розныя з табой. І княжыць разам не здолеем. Бывай. І напаследак. У княстве парушаны фінансы. Трэба склікаць сейм. Можа, падкажаш каго на фінансы.

*Разыходзяцца.*

## К А Р Ц І Н А  X V I I

*Кароль Ягайла і каралева Соф'я ў Вавелі.*

**Ягайла** *(паказвае на ліст, што ляжыць на стале)*. Жыгімонт з Вільні піша, што мой малодшы брат ажно ўскіпеў ад маёй прапановы. На яго падобна гэта. Але ж штосьці неабходна рабіць. У княстве наспяваюць падзеі.

**Соф'я.** Пакінуў бы ты, мой кароль, Свідрыгайлу ў спакоі. Хто ж не займаўся пры ўступленні на трон рэформамі?

**Ягайла.** Ты гэта лічыш рэформамі?

**Соф'я.** Няхай будуць рэформы, калі ён сабе хоча.

**Ягайла.** Бачу, ты апякуешся над маім малодшым братам?

**Соф'я.** Я шкадую яго. Дасюль у лёхах тваіх сядзеў, цяпер вунь на княстве спакою не мае.

**Ягайла.** Ну-ну, пашкадуй. Дзе ж ты была, мая каралева, калі ён вырабляў чорт ведама што?

**Соф'я.** Падрастала, мой кароль, падрастала.

**Ягайла.** Баюся, каб не выспела змова ў Вільні.

**Соф'я.** Але ж гэты Жыгімонт?! Відаць, такі ж уладалюбца, як і ягоны брат?

**Ягайла** *(смяецца)*. Уладу ўсе любяць. Ад улады мала хто адмаўляецца. Але ж дзіўна, на вальным сейме Жыгімонту не хапіла галасоў, а Свідрыгайла сабраў. Значыць, у княстве дагэтуль нейкая незадаволенасць Вітаўтам была?

**Соф'я.** Хіба ж не ведаеш?

**Ягайла.** Ты маеш на ўвазе прывілеі?

**Соф'я.** А хоць бы і яны.

**Ягайла.** Не, тут штосьці глыбейшае. Напэўна, доўгае цараванне выклікае ў людзей унутранае супраціўленне.

**Соф'я.** Проста той альбо іншы валадар надакучвае, няхай нават калі і з добрымі памкненнямі жыве.

**Ягайла.** Разумная ты ў мяне, каралева! Нездарма ж з табою больш часу трачу цяпер, чым са сваімі дзяржаўнымі дарадцамі.

**Соф'я.** Гэта таму, што ты мяне стаў кахаць больш.

**Ягайла.** Хто ведае? Але дзякуй, што не забыла наведаць мяне і сёння. Ідзі ўжо. Бачыш, тут *(паказвае на стол)* столькі розных праектаў набралася...

*Кароль цалуе каралеве руку. Каралева ў добрым гуморы выходзіць. Тады кароль торгае за шнурочак званка. Заходзіць каралеўскі Ахоўнік.*

*(Да ахоўніка)*. Няхай паклічуць мне майго старога рыцара Юльяна. І яшчэ. Як там у нас справы з тараканамі? Звяліся?

**Ахоўнік.** Наадварот, развяліся. Мы цяпер іх, ваша каралеўская міласць, разводзім.

**Ягайла** *(смяецца)*. На ферме?

**Ахоўнік.** Так, на ферме.

**Ягайла.** Тады няхай прынясуць сёння мне ў спальню.

**Ахоўнік.** Я магу ісці, ваша каралеўская вялікасць?

**Ягайла.** Так, ідзі.

*Ахоўнік выходзіць.*

*(Глыбока ўздыхае і нібыта ў насмешку сабе)*. Мабыць, сапраўды станаўлюся старым. Адно толькі і хапае мяне цяпер, што на каханне да маладое жонкі, на сякія-такія інтрыгі ў свеце ды на тараканаў...

## КАРЦІНА XVIII

*Каралева Соф'я і князь Іван Друцкі, ці не стрыечны брат яе.*

**Іван Друцкі** *(усё роўна як з насмешкай)*. Як твой стары муж, сястра?

**Соф'я** *(няйначай, не прымае ягоную насмешлівасць)*. А я ўжо не насміхаюся са свайго мужа. Здаецца, ён цяпер па-сапраўднаму кахае мяне. Значыць, як у нас там, на радзіме, гавораць – няма добрага без благога...

**Іван Друцкі.** Ну так, няма худа без дабра.

**Соф'я.** Во-во! Мне на майго мужа грэх скардзіцца. Ен мне, дурненькай, шмат што дараваў.

**Іван Друцкі.** Каралю гэта няцяжка.

**Соф'я.** Табе здаецца так. Кароль – жывы чалавек. І яму баліць. Ну, то добра. Мы не з таго пачалі. Скажы лепей, брат, што ў княстве? Ці бываеш ты ў вялікага князя?

**Іван Друцкі.** Так. Мы цяпер у Вільні жывём. У Друцк паедзем пазней, калі паляўнічы сезон пачнецца. Цяпер у нас з жонкай маленькі Ян.

**Соф'я.** Чаму Ян, а не Іван?

**Іван Друцкі.** За модай былі пагналіся. А тут Свідрыгайла раптам вялікім князем стаў. І нібыта мода тая зрабілася непатрэбнай.

**Соф'я.** Ян таксама няблага гучыць. Асабліва калі...

**Іван Друцкі.** Ну так, гэта ж адно і тое!

**Соф'я.** Дык што ў княстве? Я тут сумую і па Гальшанах, і па Друцку.

**Іван Друцкі.** Не прывыкла дасюль да палякаў?

**Соф'я.** Што мне ўжо прывыкаць! Цяпер маё ўсё тут. Дзеці прывязалі да Польшчы» канчаткова.

**Іван Друцкі.** Звычайна яно так і бывае. Спярша чалавек думае-гадае, а тады дзеці, – новыя абавязкі, новыя памкненні ў сувязі з гэтым. Словам, жыццё. Пытаеш – што ў княстве?

**Соф'я.** Так. Чамусьці зачасціў сюды Жыгімонт. Вітаўтаў брат. Я не ведаю, але кароль зноў неяк насцярожыўся да Свідрыгайлы.

**Іван Друцкі.** Хіба што! Свідрыгайла заводзіць у княстве новыя парадкі. Зразумела, адным гэта падабаецца, другім – не. Так што ўсе нашы справы ў княстве цяпер звязаны з гэтым.

**Соф'я.** Не ведаю, а я неяк да Свідрыгайлы стаўлюся з добрай душой. Можа, таму, што пакутаваў шмат. Ды і не дужа абачлівы ён. Скажы ты яму там, каб бярогся.

**Іван Друцкі.** Дзякуй, сястра. Але ці траплю я гэтым разам да караля?

**Соф'я.** Справа пільная?

**Іван Друцкі.** Так. Старая цяганіна з нашымі суседзямі.

**Соф'я** *(смяецца)*. Усё яшчэ ваюеце?

**Іван Друцкі.** Даводзіцца, сястра. Я ўжо, здаецца, і не вяртаўся б да мінулага, але яны... А тут і другая справа надышла: прасіў мяне наш падчашы, каб я перамовіўся з кракаўскім стольнікам аб шлюбе ягонай дачкі з сынам падчашага. Зноў жа старая стрэмка. Зноў праблема – праваслаўны і каталічка, каталічка і праваслаўны.

**Соф'я.** Дык ты ўжо наведаў стольніка?

**Іван Друцкі.** Не, не паспеў. Можа, вось ад цябе.

**Соф'я.** А то я хацела памагчы табе, раз ты маеш патрэбу бачыць караля.

**Іван Друцкі.** Ну?

**Соф'я.** Магу запрасіць сёння на вячэру. Мы апошнім часам з каралём вячэраем па-сямейнаму. Часцей за ўсё адны. Ен увогуле цяпер шуму людскога не любіць, а мне таксама мітусня абрыдла. Ніколі не ведала, што роля каралевы гэткая цяжкая!..

**Іван Друцкі.** Напэўна, цяжкая. *(Смяецца)*. Але я не быў каралевай, сястра.

**Соф'я.** Значыць, дамовіліся? Ты сёння ў нас вячэраеш.

*Развітваюцца.*

## КАРЦІНА XIX

*Ягайлаў сваёй спальні гуляе з тараканам, папраўляючы яго шпагай. Ахоўнік прыводзіць старога рыцара Юльяна.*

**Ягайла** *(да Юльяна)*. Што ж ты, стары таварыш, познішся? Мы з каралевай толькі што павячэралі. За сталом быў таксама наш родзіч, дакладней, стрыечны брат каралевы, – князь Іван з Вільні.

**Юльян.** Здаецца, з Друцкіх?

**Ягайла.** Так. У яго тут, у Кракаве, справы, дык мы чакалі і цябе на вячэру.

**Юльян.** Даруй, ваша вялікасць, што спазніўся. Сёння мяне доўга не было дома. Таму толькі цяпер атрымаў запрашэнне. Вядома, на вячэру з вашай каралеўскай міласцю ўжо не спадзяваўся, але падумаў – нечага ж кліча кароль?

**Ягайла.** Ведаеш, я таго старога, ну сівога, здаецца, манаха, што ў часе нашага даўняга паходу ў Масковію сустракаў, дык таго старога ўжо не бачу ў сне. Затое пачаў быў сніцца Вітаўт. Чаму б гэта?

**Юльян.** Ну так, чаму б гэта?

**Ягайла.** Толькі і робіць усяго, што мёртвы падае мне на рукі.

**Юльян.** Я, мой кароль, не ўмею разгадваць сны. Але чаму мёртвы Вітаўт?

**Ягайла.** Шчаслівы ты чалавек, Юльян. Жывеш і не ведаеш, што ў Літве ўжо на троне мой малодшы брат Свідрыгайла, а Вітаўт памёр. Разбіўся...

**Юльян.** Твая праўда, кароль. Я дужа стары. Я – старэйшы за цябе. І да мяне не ўсё цяпер даходзіць. Шкада Вітаўта, дарма, што пры ім мне месца калісь не знайшлося. Я толькі і служыў, што твайму бацьку Альгерду Міндоўгавічу ды табе вось, кароль.

**Ягайла.** Як жа ты цяпер жывеш, мой стары таварыш?

**Юльян.** А так і жыву з твае ласкі, мой кароль. Сыты-адзеты, дах над галавой. Але шкадую, што болей не сяку шабляй лазу на лузе з падлеткамі.

**Ягайла** *(смяецца)*. Занятак, вядома, рыцарскі! Ды скажы, мы ўсё-ткі ў тым паходзе ў Масковію... Калі гэта было?

**Юльян.** Ну, напэўна, тады, як хадзілі супраць маскоўскага князя на дапамогу ардынскаму хану Мамаю?

**Ягайла.** Во-во, здаецца, тады. То скажы, мы ўсё-ткі пасеклі ў тым паходзе шаблямі маскавікоў?

**Юльян.** Яшчэ як! Але не на самой бітве. Мы сапраўды дагналі адзін маскоўскі атрад, які вяртаўся з перамогай, і пасеклі да аднаго.

**Ягайла.** Значыць, недарэмны быў наш паход у Масковію?

**Юльян.** Як сказаць. Відаць, значэнне яго не толькі ў тым, што адны людзі пасеклі другіх, у тым паходзе было і другое. Там былі найбольш людзі адной веры. Дык кажаш, што твой брат Свідрыгайла цяпер на нашай Літве вялікі князь?

**Ягайла.** Так.

**Юльян.** Чаго ты мяне клікаў, мой добры кароль?

**Ягайла.** Павячэраць з табой хацеў. Я ж, ведаеш, не п’ю, а Соня часам хоча кілішак прыгубіць, бо маладая. Вось я і падумаў, што пасядзіш з намі за сталом увечары, таксама вып’еш...

**Юльян.** Дзякуй, мой кароль, за памяць.

**Ягайла.** А як табе мае тараканы? *(Хоча паказаць шпагай)*. Ну вось, пакуль мы гаманілі з табой, адзін нягоднік кудысьці знік. Але не страшна, у мяне іх тут цэлы карабок! У мяне цяпер ферма!

*Смяюцца.*

## К А Р Ц І Н А  Х Х

*Князь Іван Друцкі і вялікі князь Свідрыгайла на паляванні недзе паблізу Друці. Тут уладанні князёў Друцкіх. Чуваць паляўнічыя ражкі, сабачы брэх, стрэлы.*

**Іван Друцкі.** Мы, Друцкія, паходзім ад полацкіх князёў, дакладней, ад полацкага князя Рагвалода Барысавіча. Род наш ужо даўно падзяліўся на дзве лініі – на старэйшую і малодшую. Я належу да старэйшай, і ўсе Друцкія, у тым ліку Друцкія-Любецкія, Сакалінскія, Азярэцкія, Горскія, Багрыноўскія, Талачынскія – гэта старэйшая галіна, таксама Друцкія-Бабічавы, Адзінцэвічы, Каноплі, Пуцяціны мае далёкія або блізкія родзічы.

**Свідрыгайла.** Магутны род. Есць чым ганарыцца. І колькі ж сем’яў з гэтага вашага вялікага роду засталіся дасюль вернымі традыцыям бацькоў?

**Іван Друцкі.** Сярод нас ёсць праваслаўныя, каталікі, нават язычнікі. Так, усё яшчэ язычнікі, ці, як іх завуць цяпер, – паганыя, паганцы, людзі, якія застаюцца адданымі старым багам. Але я загаварыў цябе, вялікі князь. Паляванне ідзе без нас.

**Свідрыгайла.** Прызнацца, не люблю крыві. Я болей аматар проста пагуляць, пап’янстваваць. Зрэшты, пашумець, калі гэта прыемна альбо дае нейкія станоўчыя вынікі, і дужа адчувальны да справядлівасці. А вось скажы, князь Іван, які ўладар у большай пашане ў народа, у гісторыі, нарэшце – той, хто вечныя войны вядзе, ці той, што мірна будуе?

**Іван Друцкі** *(смяецца)*. Ну і клопат у цябе, вялікі князь! Народ любіць уладароў-стваральнікаў, гісторыя ж, здаецца, наадварот, – уладароў-ваяроў, забойцаў.

**Свідрыгайла.** Бачыш, а я ніводнай вайны яшчэ не выйграў, дарма, што ўжо не адзін раз княжыў. І не таму, што не люблю крыві. Проста хочацца людзям без вайны паслужыць.

**Іван Друцкі.** Няхай дае Бог! Але вось пра што я хацеў таксама пагаварыць з табой, Леў Альгердавіч.

**Свідрыгайла.** Гм, Леў Альгердавіч. Твая стрыечная сястра ў Кракаве таксама вось гэтак мяне называла.

**Іван Друцкі.** Каралева шануе цябе.

**Свідрыгайла.** Дык аб чым ты яшчэ меўся пагаварыць са мной?

**Іван Друцкі.** У Кракаве ходзяць чуткі, што ў нас у Вільні нібыта спее змова супроць цябе.

**Свідрыгайла.** І хто ладзіць яе?

**Іван Друцкі.** Нібыта каталіцкі Біскуп.

**Свідрыгайла.** Ну, незадаволенасць я ўжо не раз бачыў на ягоным твары. Але ж адна справа незадаволенасць, другая – змова?

**Іван Друцкі.** Я цябе не палохаю, вялікі князь, проста папярэджваю. Іначай які б я падданы табе быў?

**Свідрыгайла.** Дык падданымі лічацца і тыя, што наважваюцца на змову, калі гэта праўда.

**Іван Друцкі.** Але чуткі такія ў Польшчы ходзяць.

**Свідрыгайла** *(з хітраватай усмешкай)*. Цікава было б самому трапіць у асяроддзе змоўшчыкаў, паслухаць, аб чым яны там гавораць.

**Іван Друцкі** *(таксама з усмешкай, але ўсё роўна як разгублена)*. Можна ўявіць сабе, калі сапраўды справа да змовы дайшла!..

**Свідрыгайла.** Добра, князь Іван. Нешта трубіць ды страляць перасталі? Няйначай, без нас вепра ўпалявалі? Дзе гэта мая татарская ахова?

**Іван Друцкі.** Сёння тут і твая, вялікі князь, ахова, і мая. Так што дарэмна не трывожся. Але праўду кажаш – падамося-тка да астатніх паляўнічых. Яны цяпер недзе на беразе Друці.

**Свідрыгайла.** Я ў цябе ў гасцях, князь Іван. Як скажаш. Але не адмоў – няхай твае кухары сёння засмажаць перапёлку па даўнім звычаі. Помніш?

**Іван Друцкі.** Так, вялікі князь, хіба ж можна забыць? Перапёлку пакласці ў качку, качку ў зайца, зайца ў барана, барана ў вепра, вепра ў вала... Га?

**Свідрыгайла.** Вось-вось!

## КАРЦІНА XXI

*Надвечар таго ж дня. У друцкім замку балююць. Гаспадар пасля палявання частуе вялікага князя. Яны за сталом сядзяць побач.*
*Рыцары і шляхта на падпітку ўжо. Шум-гам.*

**Свідрыгайла** *(да гаспадара)*. Дык, кажаш, змова наспявае ў Вільні?

**Іван Друцкі** *(махае рукой)*. Ат, можа, проста плявузгаюць якія нядобразычліўцы?!

**Свідрыгайла.** Ты чакай, князь Іван, чакай. Чуткам іншы раз трэба верыць. А вось я зараз паклічу гродзенскага стольніка. *(Падае голас)*. Гэй, стольнік! Ну так, я цябе клічу, гродзенскі стольнік!

*Да княскага стала падыходзіць Чалавек у кваціcтым жупане.*

**Свідрыгайла.** Ты не ўдзельнічаеш, пан стольнік, у змове, якая рыхтуецца ў Вільні супроць мяне?

**Чалавек у квяцістым жупане** *(збянтэжана)*. Хто гэта сказаў, ваша мосць?

**Свідрыгайла.** Хто сказаў? Ды хоць бы тыя вепрукі, якіх сёння распалохалі ў князевай пушчы. Беглі ад вас паўз мяне ды шапнулі.

**Чалавек у квяцістым жупане.** Вялікі князь жартуе...

**Свідрыгайла.** А калі раптам не жартую? Добра, ідзі на сваё месца. *(Да ўсіх)*. Гэй, чаму раптам усё ў нас сціхла? Дзе музыка? Дзе скокі? *(Да гаспадара)*. Князь Іван, няхай ужо ідуць да нас твае музыкі, твае танцоры! Дзе твае пенкныя паненкі? Дзе твае прыгожыя дзеўкі?

*Па знаку гаспадара паяўляюцца дзецюкі ў знарок пашытых касцюмах, з музычнымі інструментамі; дзяўчаты ў прыгожых сукенках. Пачынаецца музыка, пачынаюцца скокі. Чуюцца спевы. Надоўга. Паступова замак сціхае.*

**Свідрыгайла** *(да гаспадара)*. Хачу цябе папрасіць, князь.

**Іван Друцкі.** Слухаю, Леў Альгердавіч.

**Свідрыгайла.** Вазьмі на сябе клопат выклікаць ад майго імя ў Вільню нашых сяброў з Полацка, з Віцебска, са Смаленска, з Магілёва, з Амсціслава, Менска... Словам, нашых.

**Іван Друцкі.** Зраблю, вялікі князь. Вось зараз жа, нягледзячы на ноч, і пашлю вершнікаў. У мяне на стайні добрыя коні. Ты глянуў бы, можа, сабе ўпадабаеш якога?

**Свідрыгайла.** Бойся дарованых коней, князь! Вунь Вітаўт узяў сабе белага!..

## К А Р Ц І Н А  X X I I

*Князь Жыгімонт і віленскі каталіцкі Біскуп.*

**Біскуп.** Нех бэндзе пахвалёны Езус Хрыстус!

**Жыгімонт** *(па-свойму)*. На векі вякоў!

**Біскуп.** Амін. *(Стаіць, не сядае)*. Здецца, князь, ужо ўсё падрыхтавана. Добразычліўцы нашы сабраліся ў малую залу. Плошча перад тваім палацам таксама поўная народу. Хочуць бачыць цябе.

**Жыгімонт.** Мы не спяшаемся, біскуп, са сваёй задумай?

**Біскуп.** Кажы – са сваёй справай. Не. З намі Бог.

**Жыгімонт.** Значыць, назад шляху няма?

**Біскуп.** Не, вялікі князь.

**Жыгімонт.** Не гавары загадзя, біскуп! Я – прымхлівы.

**Біскуп.** Аб прымхах цяпер трэба забыць. Напярэдадні вялікіх спраў пра іх звычайна забываюць.

**Жыгімонт.** Добра. Давай прадумаем усё да канца.

**Біскуп.** Канец аднаму Госпаду нашаму вядомы. Але сам я моцна ўпэўнены, што сёння князь Жыгімонт, сын Кейстута і брат незабыўнага Вітаўта, стане вялікім князем на Літве.

**Жыгімонт.** Думаеш, кароль не будзе шкодзіць?

**Біскуп.** Кароль хоць адкрыта і не багаслаўляе наш пачынак, аднак у душы моліцца за нас. Біскуп Алясніцкі запэўніў мяне, што так будзе.

**Жыгімонт.** Тады скажы, біскуп, – дзе цяпер Свідрыгайла?

**Біскуп.** Недзе ў сярэдняй Літве. Палюе, няйначай, таксама балюе.

**Жыгімонт.** Гэта пэўна?

**Біскуп.** Так. Не трэба баяцца, вялікі князь! Хадзем! Нас чакаюць!

**Жыгімонт.** Цьфу, цьфу, цьфу!..

**Біскуп.** З намі Бог!

*Каталіцкі біскуп стаіць на месцы, пакуль Жыгімонт праходзіць паўз яго. Тады рушыць за князем. З малой залы чуюцца галасы: «Далоў Свідрыгайлу! Жыгімонта ў вялікія князі! Жыгімонта! Далоў Свідрыгайлу!»*

## КАРЦІНА XXIII

*Вялікі князь Свідрыгайла са світай, аховай і абозам недзе ў лесе непадалёку ад Вільні. Вяртаюцца з паездкі па сярэдняй Літве ў сталіцу. Насустрач – вершнік: саскоквае з сядла, кідаецца да вялікага князя.*

**Вершнік.** Здрада, вялікі князь! У Вільні мяцеж!

**Свідрыгайла** *(да вершніка)*. Кажы спакойна – што, дзе, калі?

**Вершнік.** Учора вялікім князем стаў Жыгімонт. У Вільні быў бунт. Табе небяспечна ехаць у сталіцу.

**Свідрыгайла.** А што гетман?

**Вершнік.** Ен таксама ў ад’ездзе, вялікі князь.

**Свідрыгайла.** Значыць, змова ўсё-ткі выспела? Шкода, што мы не апярэдзілі іх. *(Глядзіць на князя Друцкага).* Аказваецца, твае перасцярогі былі недарэмныя?

**Іван Друцкі.** Выходзіць, так.

**Свідрыгайла** *(вельмі стрымана).* Даруй, што не адразу паслухаўся. Думаеш, я сапраўды страціў Вялікае княства?

**Іван Друцкі.** Калі гэта праўда, што Жыгімонт абвясціў сябе вялікім князем, то...

**Свідрыгайла** *(злазіць з каня, падыходзіць да вываратня, што ля дарогі, сядае).* Прызнацца, пасля той гаворкі з табой ныла маё сэрца.

**Іван Друцкі.** Што будзем рабіць, вялікі князь?

**Свідрыгайла.** Але дзівіся – як змяншаецца мая світа! *(І праўда – натоўп на дарозе неўпрыкмет радзее).* Яшчэ певень не пракукарэкаў, а яны ўжо здраджваюць!.. Я вось пра што думаю: ты паслаў ганцоў да нашых сяброў у рускія гарады, каб ехалі ў Вільню. Ці нельга іх павярнуць – на Полацк, на Віцебск?

**Іван Друцкі.** Наўрад ці, вялікі князь. Але пераняць сяго-таго па дарозе ў сталіцу можна будзе. Я распараджуся. *(Ідзе да кучкі рыцараў, што стоўпіліся на дарозе).*

**Свідрыгайла** *(да вершніка, які таксама спыніўся ля вываратня).* Значыць, у сталіцу падавацца не раіш?

**Вершнік.** Не, ваша мосць.

**Свідрыгайла.** Няўжо там у мяне сяброў не засталося?

**Вершнік.** У сталіцы мяцеж, ваша мосць!

**Свідрыгайла.** Значыць, сапраўды мутная вада ў аблоках... *(Кліча).* Князь Іван!

*Падыходзіць Іван Друцкі.*

Ну што ж, раз няма дарогі мне ў Вільню – падамся ў Полацк, а там, можа, у Віцебск. Ты не раздумаў? Застаешся са мной?

**Іван Друцкі.** Так, вялікі князь.

**Свідрыгайла** *(да тых, што засталіся з ім).* Чулі, што адбылося ў Вільні? Нікога не прымушаю, але не люблю здрады. Некаторыя ўжо пабеглі, бачу... То і вы ўсе падумайце: хто са мной, хто – не? Кажу, прымушаць не буду і караць не стану. А я ў сваю былую вотчыну. *(Да князя Друцкага).* Мы яшчэ пазмагаемся, так, князь! Ты распарадзіўся, каб рыцары пераймалі тым часам нашых сяброў?

**Іван Друцкі.** Так, вялікі князь. Я распарадзіўся.

**Свідрыгайла.** То едзем! *(Устае з вываратня, накіроўваецца да каня).*

## К А Р Ц І Н А  X X I V

*Праз нейкі час у Полацку: вялікі князь Свідрыгайла, князь Іван Друцкі, іншыя беларускія феадалы, сярод якіх князі Варатынскія, Бялеўскія, Мярэцкія, Вяземскія; таксама слуясбоўцы – ваявода Амсціслаўскі, павятовы маршалак віцебскі; вайскоўцы ў розных чынах.*

**Свідрыгайла** *(гаворыць у залу, дзе размясціліся яго паплечнікі).* Сёння ўжо пэўна, што кароль цалкам узяў бок Жыгімонта. Змяніць што-небудзь у Вільні можна толькі пры дапамозе змовы альбо адкрыта – сілай. Вы гатовы ісці вайной на Вільню?

*З лаўкі ўстае князь Іван Друцкі.*

**Іван Друцкі.** Вядзі нас, вялікі князь! Мы ўсе пойдзем за табой, куды б ты ні павёў нас!

*У зале пасля гэтага пачынаецца бязладная гамана. Свідрыгайла колькі часу прыслухоўваецца, тады гаворыць.*

**Свідрыгайла.** Пачаць вайну супраць сваіх жа, уласна кажучы, няхітрая справа, скажу вам. Але якая то будзе вайна?

*Устае ваявода Амсціслаўскі.*

**Ваявода.** Гаворка, вялікі князь, ідзе ўвогуле не аб вайне. Мы хочам бачыць на велікакняскім месцы ў Вільні Свідрыгайлу. Вось у чым галоўнае. Ну а як ажыццявіць гэта, варта падумаць. Ва ўсякім разе, я не выключаў бы паходу на Вільню.

*Чуюцца галасы: «Вядзі нас, вялікі князь!»*

**Свідрыгайла** *(рэзка хітае галавой)*. Справа ў тым, шаноўныя гаспадары, што душа мая праціўіцца пачынаць вайну ўнутры княства.

**Адзін з князёў.** Тады няварта надалей марыць аб велікакняскай уладзе! *(І не чакаючы, што адкажа на яго словы Свідрыгайла).* А мы ўжо сёння станем думаць, каб адлажыцца ад Вільні. Нас з нашымі землямі хоць цяпер забярэ пад сваю руку Маскоўскі цар. І войскам абароніць, і службу дасць!

**Свідрыгайла.** Усё вяртаецца на кругі свая. Помню, на былой нашай зборні тут гаворка такая ўжо ішла. Сёй-той з вас ужо тады пагражаў адлажыцца ад Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага.

**Адзін з князёў.** Мы не пагражаем, мы шукаем выйсця, бо пад польскім уціскам жыць не станем болей!

**Свідрыгайла.** Тады слухайце, што я надумаў. Няхай сабе Жыгімонт уладарыць на Вільні і Троках, а мы створым новае вялікае княства – Вялікае княства рускае. І будуць існаваць з гэтага дня побач тры дзяржавы: Вялікае княства Літоўскае, Вялікае княства Рускае і Вялікае княства Маскоўскае. Тады і не трэба будзе вам шукаць нейчай моцнай рукі на старане. Вось вам мая рука!

*Зала пачынае пляскаць у далоні, зноў узбураецца галасамі. Праваслаўны біскуп абводзіць прысутных трохперсцем: «Амін!» Крыкі: «Ніхай жыве вялікі князь Свідрыгайла! Няхай жыве!»*

*Гасне святло.*

**Каментарый гісторыка.** Вялікае княства Рускае, створанае на аўтаноміях Полацкай, Віцебскай і Смаленскай земляў, жыло нядоўга побач з Вялікім княствам Літоўскім. Яно спыніла сваё існаванне ў выніку... неабачлівых дзеянняў князя рускага, які не ў моцы быў адолець тонкай дыпламатыі вялікага князя на Вільні і на Троках, скаардынаванай з польскім каралём. Але пасля гэтага

неўзабаве сапраўды адлажыліся ад Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага Смаленск і так званая Северская Украіна.

**КАНЕЦ ДРАМАТЫЧНАЙ АПОВЕСЦІ.**

ІВАН
ЧЫГРЫНАЎ.
ВЕРНАСЦЬ
ПРАЎДЗЕ

ВІРТУАЛЬНЫ МУЗЕЙ
НАРОДНАГА ПІСЬМЕННІКА
БЕЛАРУСІ

libmogilev.by/chigrinov